index.php/component/content/article/97-3/kontent-ukrainskoi-reklamy-ta-zv-iazkiv-z-hromadskistiu/112-osoblyvosti-innovatsiynykh-form-reklamy.

3. Лазерная реклама [Электронный ресурс]. – URL: https:// bosstudio. net/laser.

4. Лазерная реклама – выбор оборудования для лазерной рекламы [Электронный ресурс]. – URL: http://impremium.ru/ blog/lazernaya-reklama-sekret-vashey-zametnoy-vyveski/.

5. Проекционная реклама [Электронный ресурс]. – URL: http:// https://pogumax.ru/proeksionnaya-reklama.

6. *Родичев, И.* Интерактивная реклама. Методы, примеры и технологии / И. Родичев [Электронный ресурс]. – URL: http://bubunta.com/ interaktivnaja-reklama-metody-primery-i-tehnologii.html#more-2155.

7. Тривизор [Електронний ресурс]. – URL: http://www. trivizor.ru.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПАЛАТНЯНЫ ШЛЯХ МАСТАКА. АЛА ІВАНАЎНА НЕПАЧАЛОВІЧ

***Т. І. Васюк,*** *дацэнт,*
*дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Ала Іванаўна Непачаловіч – незвычайны мастак. Яна рэалізавала амаль усе свае задумкі ў ткацтве. Яе палотны складаюць гонар сучаснаму дэкаратыўна-прыкладному мастацтву Беларусі. Манументальны і камерны тэкстыль быў побач з ёю заўсёды. Працуючы на Барысаўскім камбінаце прыкладнога мастацтва імя А. М. Кішчанкі, Ала Іванаўна паспяхова аздобіла многія архітэктурныя аб’екты з дапамогай «адзення сцэны» і іншых манументальных пано. Цэнтральную пазіцыю ў яе творчасці займае аздабленне інтэр’ераў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Аздабленне грамадскіх аб’ектаў культуры надало мастаку-тэкстыльшчыку ўпэўненасць у сваіх сілах. Ала Іванаўна працягвала развіваць эксперыментальную творчасць і навуковае даследаванне традыцыйнага беларускага ткацтва. Гэтаму працэсу спрыяла і праца ў складзе навукова-творчай лабараторыі «Традыцыйныя рамёствы беларусаў», створанай па рашэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2002 г. на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

У адпаведнасці з праграмай навукова-творчай лабараторыі былі адноўлены, рэстаўраваны і рэканструяваны старажытныя тэхнікі і тэхналогіі мастацкага ткацтва беларусаў, якія ўключаліся ў навучальны працэс кафедры народных рамёстваў (цяпер кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва). Паводле тэхнічных і тэхналагічных актаў укаранення ў навучанне аргументаваных мастацкіх вобразаў створаны цікавыя аўтарскія працы студэнтаў і выпускнікоў універсітэта. Творчы, педагагічны і навуковы вопыт дацэнта Алы Іванаўны Непачаловіч аб'яднаўся ў своеасаблівы «палатняны шлях», жыццё якога будуць працягваць яе вучні.

Канцэпцыя «палатнянага шляху» была агучана Алай Іванаўнай за год да яе адыходу ў лепшы свет. 1 студзеня 2021 г., на сямідзясятым годзе жыцця, яе не стала, спынілася нястомная імклівая плынь, а творы, якія яна зрабіла, будуць працягваць «палатняны шлях мастака».

Адзін з іх пад назвай «Рытмы зямлі» – дэкаратыўнае пано з вертыкальным кампазіцыйным рашэннем. Яно дэманстравалася на многіх выставачных пляцоўках Беларусі і за яе межамі – у Польшчы, Іспаніі, Германіі і Расіі.

Гарманічныя, тонкія паводле прапорцый і рытмаў працы «Купаль-зорачка», «Жыва» і іншыя тканыя палотны створаны ў адным экзэмпляры. Гэта ўнікальныя мастацкія і тэхналагічныя спалучэнні пластыкі, каларыту, перапляценняў фактур і малюнку ўзору. Колер, рытм, каларыт стваралі ў яе працах гучанне аргана з высокімі нотамі, якія ішлі ў нябёсы. Такім вылучалася яе палатно, прысвечанае тату-лётчыку, Герою Савецкага Саюза.

Прынцыпова іншае адчуванне з'яўляецца ад групавых і персанальных выстаў. У творах на такіх выставах прысутнічае не толькі асабістае светаадчуванне мастака. Ала Іванаўна ажыццявіла вялікае мноства праектаў з удзелам групы мастакоў, у тым ліку разам з мастакамі-керамістамі, дзе пластычнае мастацтва керамікі ператварае экспазіцыйную прастору ў суўдзельніка экспазіцыі. Такія выставы праходзілі ў музеі сучаснага мастацтва, у Лошыцкай сядзібе, у Палацы мастацтваў, галерэі «Універсітэт культуры», на іншых выставачных пляцоўках г. Мінска і краіны, а таксама ў амбасадах Іспаніі і Германіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Эксперыментальны беларускі тэкстыль у канцы XX – пачатку XXI ст. набывае шырокую вядомасць ва ўсім свеце. Вабяць яго высокае мастацтва і прафесіяналізм, хараство і захаванне традыцый у сучасных умовах.

Ала Непачаловіч сінтэзавала сучасныя і традыцыйныя плыні ў мастацкім тэкстылі ў адзіны напрамак дзейнасці мастакоў. Яна актыўна займалася грамадскай дзейнасцю: доўгія гады была ў складзе мастацкіх і экспертных саветаў. Сярод яе вучняў – дзясяткі лаўрэатаў і стыпендыятаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Сама Ала Іванаўна ў 2020 г. стала лаўрэатам другога трыенале выяўленчага мастацтва ў намінацыі дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Гэта самая грунтоўная яе перамога ў шэрагу шматлікіх перамог. У асобе Алы Іванаўны палатно набыло шырокі мастацкі і філасофскі сэнс. Палатно – гэта нашы жыццёвыя дарогі: доўгія, кароткія, шурпатыя, гладкія, каляровыя, шэрыя – усе яны маюць адпаведныя водгукі ў душы мастака. Працавітасць, пранікнёнасць, апантанасць, чуласць, рашучасць былі заўсёды з Алай Іванаўнай Непачаловіч. Яе чулая душа мела асабістае пакліканне дзеля таго, каб «ткаць узор радзімы васілька…».

Недзе там, у сусвеце, размясцілася яе зорка, душа мастака, якая шле святло на зямлю ў выглядзе жоўтых кветак, каб не забылі аб высокім і вечным жыцці для мастацтва…

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ХУДОЖЕСТВЕННАЯ ИНТЕРПРЕТАЦИЯ ФИЗИЧЕСКИХ СВОЙСТВ МУЗЫКИ В ТВОРЧЕСТВЕ М. КЛИМАСА И Ф. ОФНЕРА

***Н. И. Влазнюк,***

*старший преподаватель кафедры русского языка как иностранного Белорусского государственного университета культуры и искусств*

Работы немецкого фотографа Мартина Климаса (Martin Klimas, 1971 г. р.), представителя художников нового поколения, благодаря своей точности и аккуратности находятся на стыке искусства и науки. Влияние на стиль его фотографий